# Віртуальная геаграфія

**Бібліятэкі, як і ўсе ўстановы культуры, праходзяць складаны, але важны працэс трансфармацыі ў сувязі са зменамі ў інфармацыйнай прасторы і тэхналагічнымі прагрэсам. Такое меркаванне выказаў Алесь Суша, намеснік генеральнага дырэктара — дырэктар па навуковай рабоце і выдавецкай дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, падчас прымеркаванай да Дня бібліятэк прэс-канферэнцыі «Аб развіцці бібліятэчнай справы ў Рэспубліцы Беларусь».**

Бібліятэчная галіна ў краіне склалася ў тым ліку дзякуючы рэформам, якія дзейнічалі з 1990-х гадоў. У Беларусі дзейнічае звыш 7 тыс. бібліятэк, яны прысутнічаюць фактычна ва ўсіх ведамствах дзяржаўнага кіравання краіны. На пачатак года ў сістэме Міністэрства культуры, напрыклад, налічвалася 2524 бібліятэкі. Акрамя таго, бібліятэчны фонд краіны ўключае каля 180 млн фізічных дакументаў, а фонд Нацыянальнай бібліятэкі — звыш 10 млн.

Як адзначыў Алесь Суша, фіксуюцца новыя тэндэнцыі ў развіцці бібліятэчнай сістэмы, адна з якіх — пераход у віртуальную прастору. На прыкладзе Нацыянальнай бібліятэкі адзначаецца, што яе чытачы, як і раней, прыходзяць ва ўстанову. Аднак штогадова расце і колькасць віртуальных наведванняў. На сёння гэта звыш 70 працэнтаў. «Акрамя таго, увесь свет мае магчымасць далучыцца да сабраных намі інфармацыйных рэсурсаў, у сувязі з чым пашыраецца геаграфія: у ліку нашых карыстальнікаў — жыхары Зімбабвэ, Куала-Лумпура, Танзаніі», — расказаў Аляксандр Суша.



*Фота з сайта calameo.com.*

Між тым у бібліятэцы значна развіўся спектр інфармацыйных паслуг і рэсурсаў, якія прадастаўляюцца беларускаму чытачу ў тым ліку анлайн. Закупляюцца базы даных найбуйнейшых распрацоўшчыкаў і агрэгатараў з усяго свету, адкрываюцца новыя рэсурсы ў анлайн-доступе, палепшылася таксама сфера віртуальнага кансультавання. Для любога ахвотнага даступна асноўная навуковая перыёдыка, публікацыі, дысертацыі і іншыя дакументы з усяго свету.

**Яўгенія ШЫЦЬКА**